Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Даўгінаўская сярэдняя школа
імя У.І. Слабодчыкава ”

# Гульня-віктарына “Наша Беларусь”

Настаўнікі-дэфектолагі
Н.А.Цімашчук
Г.П. Пратасевіч

**Гульня- віктарына “Наша Беларусь”**

Задачы: праверыць веды вучняў пра сваю Радзіму, выхоўваць любоў да яе, развіваць пазнавальную актыўнасць і творчыя здольнасці.
Падрыхтоўка: клас дзелщца на дзве каманды («Васілінка» і «Несцерка»),
На дошцы размешчана карта Беларусі. На стале стаіць букет васількоў з каласкамі.

ХОД ГУЛЬНІ
Гучыць запіс песні «Мой родны кут». Вядучы (чытае верш Васіля Віткі «Беларусь»).

На карце вялікага свету
Яна, як зялёны люток.
Песня гарачага лета,
Крынчнай вады глыток,
Адвечная калыханка,
Душы запаветны куток,
Трапеча гарачым ранкам
На дрэве нястомны лісток.
А ў навальніцу б'ецца,
Небачны паміж лісця,
Як роднае матчына сэрца,
Што мне даражэй жыцця.

Зараз на момант вы будзеце мастакамі, але маляваць прапаную не алоўкамі, а словамі. Трэба «намаляваць» карціну пра нашу Беларусь. Кожнае прыгожае слова трэба растлумачыць і абазначыць кветачкай, якую потым паставще ў сваю вазачку. Заданне «мастакі» каманд выконваюць па чарзе. Перамагае тая каманда, у якой кветачак у вазе будзе больш.
*(Сінявокая. У нас шмат прыгожых рэк і азёр, а яшчэ у беларусаў сінія вочы. У полі сустракаюцца сінія васількі.*
*Зяленая. Шмат лясоў, палёў, лугоў.*
*Дружалюбная. Беларусы — народ дружалюбны і гасцінны. На вуліцах нашых гарадоў можна ўбачыць людзей з розных краін.*
*Лепшая. Таму, што гэта наша Радзіма.*
*Белая Русь. Белы — колер дабра і чысціні. У пакоях беларусаў шмат белага: белыя сцены, белыя фіранкі на вокнах, белы абрус на стале. Здаўна беларусы любілі апранацца ў белыя льняныя кашулі.*
*Прыгожая. У нас прыгожыя гарады і вескі.*
*Працавітая. У Беларусі жывуць працавітыя людзі, якія робяць шмат патрэбных рэчаў.*
*Лясная. Шмат лясоў. бароў, пушчаў.*
*Дзівосная. У нас дзівосныя вырабы з саломы, з гліны, драўляныя цацкі, вышываныя ручнікі.*
*Шчодрая. Наша краіна дапамагае народам іншых краін у цяжсія гадзіны.*

*Партызанская. У гады Вялікай Айчыннай вайны у беларускіх лясах знаходзілася шмат партызанскіх атрадаў, якія змагаліся супраць нямецкіх захопнікаў.)*

В я д у ч ы. Цудоўная карціна і прыгожыя букеты з розных слоў атрымаліся пра нашу Беларусь.

Аб прыгажосці нашай Беларусі напісана шмат вершаў беларускімі паэтамі. Давайце паслухаем вершы, якія падрыхтавалі каманды.

Выходзяць вучні з каманды «Васілінка».

1-ы вучань (чытае верш А. Вольского «Радзіма»).

Радзіма ў нас — безмяцежная,
слякотная і снежная.
Радзіма ў нас — цудоўная,
багаццяў розных поўная.
Радзіма ў нас — магутная
І ва ўсім свеце чутная.

2-і вучань (чытае верш А. Вольскага «Непаўторны край»).

То ялінкі, то сасонкі
Падпіраюць небакрай...
Прыгажэйшае старонкі
Не знайсці, як не шукай.
Скачуць сонейка асколкі
Пасля дождженьку ў вадзе.
Весялейшае вяселкі
Не пабачыш анідзе.
Пахне збожжа свежым хлебам.
Сыпле золата жніво.
Жаўрукі звіняць пад небам —
Славяць свету хараство.
На бярозе — белы бусел.
Пад бярозаю — ручай.
А завецца Беларуссю
Непаўторны родны край.

Выходзяць вучні з каманды «Несцерка».

В я д у ч ы. Наступны конкурс называецца «Падумай і адкажы».

Па чарзе кожнай камандзе задаецца пытанне. Калі каманда не можа адказаць на пытанне, на яго адказвае другая каманда. За кожны правільны адказ — 1 бал.

1. Назавіце сталіцу Рэспублікі Беларусь. (Мінск.)
2. Назавіце прэзідэнта краіны. (А. Р. Лукашэнка.)
3. З якімі краінамі мяжуе Беларусь? (Літва, Латвія, Польшча, Украіна, Расія.)
4. Чаму беларусаў называюць, бульбашамі? (Бульба — другі хлеб беларусаў, самая любімая страва.)
5. Якое возера ў нас называюць «Беларускім морам»? (Возера Нарач.)
6. Назавіце самую вялікую раку Беларусі. (Днепр.)
7. Назавіце, якія колеры на беларускім сцяге? (Чырвоны, зялёны, белы.)

8. Якіх славутых людзей Беларусі вы ведаеце? (Еўфрасіння Полацкая, Сімеон Полацкі, Францыск Скарына.)
9. Якіх беларускіх паэтаў і пісьменнікаў вы ведаеце? (Янка Купала, Якуб Колас, Максім Багдановіч, Пятрусь Броўка.)

В я д у ч ы. Ад кожнай каманды запрашаю па два ўдзельнікі да дошкі. Ім трэба назваць назву горада, які пачынаецца з вызначанай літары. Хто хутчэй і правільна зробіць, той і будзе пераможцам.

В я д у ч ы. Наступнае заданне аднолькавае для кожнай каманды. Трэба разгадаць крыжаванку. Калі ўсе рэкі ў крыжаванцы будуць названы правільна, то ў выдзеленым слупку вы прачытаеце назву самага вялікага возера Беларусі. На гэта заданне даецца 2 хвіліны.
1.Галоўны прыток Дняпра.
2.Прыток Заходняй Дзвіны, бярэ пачатак у Літве.
3.Самая вялікая рака нашай рэспублікі.
4. Рака, якая пачынаецца ў Мінскай вобласці і працякае праз г. Гродна.
5. Невялікая рэчка, якая ўпадае ў Заходнюю Дзвіну.
*Адказы: 1. Бярэзіна. 2. Дзісна. 3. Днепр. 4. Нёман. 5. Ушача.*
*У выдзеленым слупку — Нарач.*

**Гульня “Перакладчыкі”. (***Вучні перакладаюць словы з рускай мовы на беларускую.)*
Карандаш - …аловак
Родина - …
Тетрадь - …
Учебник - …
Утро - …
Ёж - …
Дождь - …
Осень - …

Неацэнны моўны скарб нашага народа - прыказкі і прымаўкі. Ужо няма тых людзей, якія прыдумалі гэтыя трапныя выразы, а прыказкі працягваюць жыць. Прыказкі і прымаўкі даюць карысныя парады, вучаць нас дабру, перасцерагаюць ад дрэнных учынкаў. Ці ведаеце вы беларускія прыказкі і прымаўкі?
(Вучні называюць прыказкі і прымаўкі).

- Шануй бацьку з маткай, другіх не знойдзеш.
- Хто працуе, той не сумуе.
- Спяшыць - людзей насмяшыць.
- Усюды добра, а дома лепей.
- Дарагая тая хатка, дзе радзіла мяне матка.
- Хто пытае, той шмат знае.
- Малая пчала, ды і тая працуе.

- Чалавек невучоны, як тапор нетачоны.

Заўсёды беларусы вызначаліся здатнасцю да жартаў, кемлівасцю. Скарбонкай народнай мудрасці і назіральнасці лічацца беларускія загадкі. Кемлівасці, дасціпнасці вучыліся дзеткі, калі адгадвалі загадкі. Паглядзім, ці кемлівыя вы, дзеці?
*( Адгадванне загадак.)*
Блакітнае вока ад зямлі высока. (Неба)

Нахмурыцца , насупіцца,
У слёзы ўдарыцца -
Нічога не застанецца.(Хмара)

Хвост мой пушысты, кажух мой агністы,
Хітрай называюць і курэй хаваюць. (Лісіца)

Крылаў не мае, а лятае,
Без рук, а вароты адчыняе,
Без голасу, а спявае.
Без пугі, а хмары ганяе. (Вецер).

Прыйшла чорна маці, усіх паклала спаці.(Ноч)

Ён раскажа і пакажа, як жыве планета наша.
А няма электратоку - ён без мовы і без зроку. (Тэлевізар)

З гаспадаром сябруе, дом вартуе.
Ляжыць пад ганкам - хвост абаранкам.(Сабака.)

Сосны лечыць ён з вясны,
Доктарам завуць лясным. (Дзяцел)

Я ў вас вось што запытаю,
Вы скажыце, госці, мне:
Ці вам добра тут, ці не?
Ну, тады чаго чакаеце?
Чаму артыстаў не вітаеце?

**Ехалі з горкі скарагаворкі**. Па дарозе разбіліся на дзве часткі. Іх трэба сабраць.*(Вучні злучаюць часткі скарагаворак).*

| | |
|---|---|
| У чаплі чапляня, | беламу зайку. |
| Белы бусел баяў байку | таўкуць мак камары. |
| На двары без пары | марынавала і ўсё змарнавала. |
| Марынавала Марына, | у зайкі зайчаня. |

*(Вучні вучацца выгаворваць скарагаворкі.*
**Завітала ў госці казка – сустракайце, калі ласка!**

У даўнія часы, калі простыя людзі яшчэ не ўмелі пісаць, расказвалі адзін аднаму, сваім дзецям розныя цікавыя казкі. Героямі казак былі жывёлы, а таксама выдуманыя істоты. Сюжэты казак былі не толькі забаўляльнымі, але многаму маглі навучыць.

Сёння мы ўспомнім з вамі казкі, складзеныя беларускім народам.

- Якімі словамі пачынаецца казка "**Курачка-раба"?**

"Жыў дзед, жыла бабка. Была ў іх курачка-раба. Нанесла курачка яечак поўны падпечак. Сабрала бабка яечкі ў чарапіцу, ды паставіла на паліцу".

- Што крычаў Пеўнік, калі яго схапіла ліса? (**Казка "Коцік , пеўнік і ліса".)**

"Коце, браце!
Мяне ліска нясе
У высокія горы,
У глыбокія норы,
Па барах, па карчах,
Аж бярэ мяне страх!"

- Якімі словамі пачынаецца казка **"Сынок з кулачок"?**

"Жылі дзед і баба. Быў у іх сынок. Ды такі малы, што з-пад шапкі не відаць. Не большы за кулак".

- Што казала каза-манюка кожны раз дзеду, калі вярталася з пашы?

" – Нідзе не была. Нічога не ела, нічога не піла. Толькі як бегла цераз масток, ухапіла кляновы лісток, а як бегла ля крынічкі, ухапіла кропельку вадзічкі…"

- Як заканчваецца казка "**Піліпка-сынок"?**

" А Піліпка прыляцеў з гусямі дахаты. Зарадаваліся бацькі, што Піліпка вярнуўся, пасадзілі яго за стол, пачалі частаваць. А гусям далі аўса. Тут і казка ўся."

(Вучні дзеляцца на 2 каманды і складваюць з разразных частак казку.)

**Беларуская народная гульня "Маша".**

Усе становяцца ў кола, пасярэдзіне знаходзіцца Маша з завязанымі вачамі. Дзеці прыгаворваюць:

Маша, ты пацеха наша!
Ручкі з золата, ножкі з долата,
Валасы кудлатыя, а вочы зыркатыя.

*(Маша хапае каго-небудзь з кола і спрабуе адгадаць, хто гэта. Калі яна адгадае імя дзіцяці, той становіцца Машай, калі не - працягвае лавіць дзяцей і адгадваць).*

**Паслухайце яшчэ адну гісторыю**.

Ці то полем, ці то лесам ішлі тры падарожнікі. Ішлі яны тры дні і тры ночы ды яшчэ паўдня. Раптам чуюць – спявае нехта. Першы кажа:

- Відаць, жаўранак спявае.
- Не, - кажа другі, - гэта лес шуміць.

А трэці прыпаў вухам да зямлі і прашаптаў:

- Ды гэта ж зямля спявае.

Вось якая яна, наша беларуская зямля!

*(Вучні чытаюць вершы пра родны край).*

Я - беларус, я нарадзіўся
На гэтай казачнай зямлі.
Дзе між лясоў і пушчаў дзікіх
Адвеку прашчуры жылі.

Я - беларус, я ганаруся,
Што маю гэтае імя.
Аб добрай славе Беларусі
У свеце знаюць нездарма.

Я - беларус, і я шчаслівы,
Што маці мову мне дала,
Што родных песень пералівы
І зблізку чую і здалля.

Я - беларус, і хоць сягоння
Яшчэ малы, але скажу:
“Я родам з племя непакорных
І прад бядой не задрыжу.”

Высока ў небе вырай кружыць,
Ляціць за сіні небакрай.
Не забывай ніколі, дружа,
Сваю зямлю, свой родны край!